Рынкевіч, К. Да народных рамёстваў цікавасць не сціхае / К. Рынкевіч // Міёрскія навіны. 2020. – 14 ліп. – С. 8.

ДА НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ ЦІКАВАСЦЬ НЕ СЦІХАЕ

Прыемная і важная місія ў супрацоўнікаў Дзісненскага гарадскога Дома рамёстваў. Вывучаюць, адраджаюць, захоўваюць, надаюць новы імпульс творчым заняткам, за якімі праводзілі вольны ад гаспадарчых клопатаў час нашы продкі. Арыгінальныя вырабы ўбіраюць у сябе цеплыню ўмелых рук майстра і святло яго ўсмешкі, густыя подыхі даўніны і лёгкія павевы сучаснасці.

Першая палова чэрвеня ў дзісненскіх майстроў звычайна праходзіць у паездках. Скіроўваюцца выхаднымі ў Паставы на фестываль «Звіняць цымбалы і гармонік», на свята песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўна». Сёлета з-за пандэміі маршрутаў паменела, аднак спраў у народных умельцаў па-ранейшаму шмат.

– Рыхтаваліся да святаў у Дзісне і Міёрах. Па традыцыі, будзем удзельнічаць у «Славянскім базары». Пакрысе ідзе падрыхтоўка да экафэсту «Жураўлі і журавіны Міёрскага краю», – расказвае дырэктар установы Людміла Ганебная. – Творчыя накірункі ў нас ранейшыя: кераміка, разьба па дрэве, ткацтва, лапікавае шыццё, вязанне. Асвоілі тэхніку работы з ільнянымі ніткамі.

У Дзісненскім Доме рамёстваў усяго чатыры супрацоўнікі. Гледзячы на мноства работ, нельга не здзівіцца, як паспяваюць столькі зрабіць. Напэўна, сакрэт у згуртаванасці калектыву і глыбокай захопленасці кожнага майстра справай, якая патрабуе нямала сіл і разам з тым служыць крыніцай энергіі і натхнення.

За ўлюбёным заняткам засталі Уладзіміра Майсяёнка. Выразаў па дрэве. Побач на стале мноства папяровых эскізаў, якія пераносіць на драўляную аснову, дапаўняючы ці змяняючы выяву. Як у дасканаласці няма межаў, так і плынь творчага працэсу не ведае прыпынкаў, выліваючыся ў новыя знаходкі. Набіўшы руку ў вырабе арыгінальнага драўлянага абрамлення для насценных гадзіннікаў, майстар пачаў рабіць зручныя і стыльныя рэчы для кухні. Напрыклад, невялікі паднос у выглядзе дубовага ліста падыдзе для ласункаў да чаю.

Развіваецца ў руках Яўгеніі Козел ільняная нітка і паціху ператвараецца ў сімпатычную фігурку коніка, дэкаратыўны кошычак, прывабны млын. З кавалачкаў тканіны стварае цікавыя і практычныя рэчы Наталля Валенцік. Да прыкладу, гусі-пакетнікі будуць да месца на кухні ў якасці схованкі для дробных прыбораў або ў спальні як арганайзер для начной кашулі.

Дырэктар установы Людміла Ганебная адпачывае душой, плетучы паясы ці вяжучы кручком дыванкі. Апошніх ужо цэлая калекцыя.

– Гэта распаўсюджанае рамяство ў нашай мясцовасці. Раней у кожным доме ля парога, печы, ложка слалі дыванкі, звязаныя з абрэзкаў тканіны. Цікавасць да іх вяртаецца, – расказвае субяседніца. – Асновай для такіх вырабаў часам служаць пластыкавыя пакеты з-пад малака, кефіру і так далей. Для нас гэты матэрыял не падыходзіць, бо не з'яўляецца традыцыйным.

Стракатымі дыванкамі майстры аздобілі новую выязную палатку. У мінулым годзе сродкі на яе пакупку выдзеліў райвыканкам. Яшчэ на швейную машынку хапіла.

– З новай палаткай ездзілі на мінулагодні «Славянскі базар». Прасторная, ёсць дзе вырабы расставіць і самім размясціцца, – гаворыць Людміла Вікенцьеўна. – Сёлета вырашылі аформіць яе

ў народным вясковым стылі. Унутры дэкаратыўная печ як аснова ўсяго дома, сцены ўпрыгожылі дыванкамі. Звонку – сланечнікамі з тканіны.

Дзісненскі Дом рамёстваў – актывіст на абласных творчых выставах. Па выніках за мінулы год выйшаў на другое месца. Сёлета таксама паспелі зарабіць бонусы. Наведаліся на аглядконкурс «Ад прашчураў да зор» у Расоны. Удзельніца гуртка «Чароўны паясок» Анастасія Козел спляла пояс дзісненскага строю і заняла трэцяе месца. На выставе народнай творчасці, прысвечанай 75-годдзю Вялікай Перамогі, трэцяе месца ў намінацыі «Падарунак ветэрану» заняла работа Людмілы Ганебнай – пано, «сатканае» з ільняных нітак; драўляныя пано Уладзіміра Майсяёнка таксама на трэцяй пазіцыі ў намінацыі «Салют Перамогі». Рыхтаваліся да наступных конкурсаў, але каронавірусная пандэмія зрабіла перапынак.

Творчы працэс – з'ява няспынная. Прычым не толькі для тых, хто абраў рукадзелле сваёй прафесіяй. Як расказваюць майстры, і ў час неспрыяльнай эпідсітуацыі мясцовыя жыхары прыходзілі займацца ў гуртках. Апрацоўвалі рукі антысептыкам, апраналі маскі і браліся за цікавую справу. Плялі паясы, вязалі на спіцах і кручком, займаліся габеленам, майстравалі вырабы з ільняных нітак і так далей. Пад кіраўніцтвам умелых настаўнікаў усё атрымлівалася.

Незалежна ад знешніх фактараў прыходзяць творчыя ідэі. Пакуль майстры рыхтуюцца да фестываляў, на клумбе ля будынка, у якім размясціўся Дом рамёстваў, набіраюць моц мята, меліса, мацярдушка. З духмяных траў, якія самі сёлета пасадзілі, пасля зробяць фітачай. Яшчэ квецень ліпы збяруць. Сыравіну для карыснага напою насыпяць у дэкаратыўныя льняныя мяшочкі. Так з'явіцца чарговы сувенір – арыгінальны і практычны. І актуальны ў любыя часы.

Кацярына РЫНКЕВІЧ.